правлениях и способах транспортировки товаров внутренней и внешней торговли. Автором были сделаны следующие выводы.

В начале 1860-х гг. Виленская губерния Российской империи принимала существенное по размерам капиталовложений участие в товарообмене с западными странами посредством водных путей. Отсюда вывозились преимущественно зерновые культуры и лес.

Белорусское население Лидского, Ошмянского, Дисненского и Вилейского уездов Виленской губернии было задействовано только во внутреннем товарообороте во время ярмарочных дней, совершении разовых и регулярных сделок на рынках. В начале XX в. происходило общее падение удельного веса ярмарочной торговли ввиду интенсивного расширения стационарной торговой сети.

Появление в 1862 г. первой железнодорожной линии Петербург–Варшава не смогло существенно изменить экономического положения этнически белорусских территорий, так как основная доля железнодорожных поставок за рубеж приходилась на Вильно и Виленский уезд. Несогласованность тарификационной политики Министерства финансов России с нуждами местного населения, аграрный кризис в последней четверти XIX в. окончательно сделал невыгодным в Беларуси производство зерна на рынок.

Основным торговым партнёром Виленской губернии в указанный период выступала Германия, чему способствовали географическая близость, сообщение через реки Вилию и Нёман, а позднее – прямое сообщение по железной дороге, оговоренное в ряде дифференцированных железнодорожных тарифов.

**СПИСОК ЦИТИРОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ**

1. Довнар-Запольский, М.В. Народное хозяйство Белоруссии. 1861–1914 гг. / М.В. Довнар-Запольский. – Мн., 1926.
2. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 / Под ред. Н.А. Тройницкого. 4 Виленская губерния, тетрадь 1. – СПб., 1900. 55 с.
3. Литовский национальный исторический архив. Ф. 388. Оп. 1. Д. 316(1).
4. Литовский национальный исторический архив. Ф. 388. Оп. 1. Д. 316(2).
5. Каханоўскі, А. Сацыяльнае аблічча купецтва Беларусі на мяжы XIX–XX стст. / А. Каханоўскі // Веснік БДУ. Сер. 3. – 2004. – № 2. – С. 9–11.
6. Новейшая история Отечества. XX век. Учеб. для студентов вузов. В 2 т. / Под ред. А.Ф. Киселёва, Э.М. Щагина. – М.: Гуманитар. изд. центр ВЛАДОС, 1998. – Т. 1.
7. Россия. 1913 г. Статистико-документальный справочник / РАН. И-т Российской истории. – СПб: БЛИЦ, 1995.
8. Литовский национальный исторический архив. Ф. 388. Оп. 1. Д. 315(2)(1).
9. Литовский национальный исторический архив. Ф. 388, оп. 1, д. 1017(3).
10. Бобровский, П. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерния. / П. Бобровский. – СПб., 1863. – Ч. 2.
11. Бейлькин, Х.Ю. Сельскохозяйственный рынок Белоруссии 1861–1914 гг. / Х.Ю. Бейлькин; науч. ред. М.О. Бич. – Мн., 1989.
12. Моравский, А.Ю. Итоги районного Съезда Северо-Западного края по вопросам экспорта в связи с пересмотром торгового договора с Германией. (20-24 марта 1914 г. Вильно) / А.Ю. Моравский. – Вильно, 1914.

*Материал поступил в редакцию 15.09.09*

**MALYKHINA L.Ju. Development of trade in Vilno province at the end of the 60–90 XIX-th century**

The article investigates trade and monetary relations of Belarusian districts of Vilno province at the end of the XIX-th – beginning of the XX-th century. On the whole were received the results about the volumes, main directions and ways of transporting the goods of home and foreign trade.

УДК 925.5 (476)

***Папко В.М.***

# РОД ТАРАСОВІЧАЎ У ВАЎКАВЫСКІМ ПАВЕЦЕ ГРОДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ Ў XIX-XX СТСТ.

У гісторыі шляхецкіх родаў, якія валодалі маёнткамі на беларускіх землях, адлюстраваліся ўсе супярэчнасці і калізіі таго часу. Прыкладам таго, як трагічныя падзеі XIX-XX стст. адбіліся на лёсе шляхецкіх сем'яў, служыць гісторыя роду Тарасовічаў*.

Захаваліся разрозненыя звесткі аб прадстаўніках рода, якія жылі ў XVIII ст. Сярод пераліку служачых пружанскага ніжняга земскага суда прысутных за 1803 г. згадваецца засядацель шляхціц Ігнацій Юр'евіч Тарасовіч. У в. Касілавічы Пружанскага павета яму належылі 22 прыгонных селяніна мужчынскага пола. Ігнацій Тарасовіч нарадзіўся ў 1757 г. Са студзеня 1788 г. ён служыў павятовым ваўкавыскім ротмістрам. У лютым 1796 – лютым 1797 гг. займаў пасаду "порядкового комиссара, председательствующего в Пружанском нижнем земском суде заседателей". У красавіку 1800 г. ён быў выбраны ў тым самым судзе засядацелем. Узяў за жонку шляхцянку Алену Рымшу (у дакуменце імя і прозвішча напісаны неразборліва), дзяцей на той момант не меў [1, арк. 85–87].

Відаць, што ўжо ў пачатку XIX ст. род Тарасовічаў валодаў некалькімі маёнткамі ў Ваўкавыскім павеце Гродзенскай губерні. Род не належыў да ліку вельмі заможных і значных. Першы вядомы на дадзены момант прадстаўнік роду на ваўкавыскай зямлі – Дамінік Тарасовіч, які меў сына Францішка (?–1836). Не пазней 1817 г. да Францішка і яго жонкі Ганны з роду Бегайла ад роду Ромераў перайшоў маёнтак Гнезна, які знаходзіўся недалёка ад Ваўкавыска [2, с. 209]. Францішак і яго другая жонка Магдалена (?–1822) пахаваны ў Гнезна, дзе да нашых дзён захавалася капліца з родавым склепам Тарасовічаў. Склеп упрыгожаны абеліскам з крыжом, на якім напісана: "Дом вечнага пакоя Вяльможных Францішка і Магдалены з Дахтаровічаў Тарасовічаў, які памёр у 1836 г., якая памерла у 1822 г."**

Сын Францішка Геранім меў за жонку Розу Булгарыну. Геранім і Роза пакінулі трох сыноў: Дамініка-Стэфана, Канстанціна і Уладзіслава [3, арк. 35 адв. –36].

Гераніму належыў маёнтак Конна ў Ваўкавыскім павеце. Маёнтак знаходзіўся ў 1\4 вярсты ад в. Конна, у 4 верстах ад Зельвы і 20 верстах ад Ваўкавыску. Маёнтак быў адносна невялікім – налічваў усяго толькі 924 дзес. 1766 кв. саж. зямлі. Па дадзеных 8-й рэвізіі, ў в. Конна пражывала 157 душ прыгонных мужчынскага полу і 123 – жаночага. У другой палове 40-х гг. XIX ст. было 153 мужчыны і 153 жанчыны [4, арк.15]. Відаць, Геранім валодаў некалькімі маёнткамі, якія пазней перайшлі да яго сыноў. Не вядома, хто з іх быў старэйшым.

***Попко Ольга Николаевна,*** *кандидат исторических наук, доцент кафедры философии и культурологии Брестского государственного технического университета.*
*Беларусь, БрГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*

* *У некаторых дакументах выкарыстоўваліся памылковыя формы гэтага прозвішча – "Тарасевіч" або нават "Тарассевіч".*

** *Дадзеныя прадстаўлены А.Т. Федаруком.*



***Іл. 1.*** Маёнтак Воля, пасля палявання. Уверсе з дзвума стрэльбамі Станіслаў, унізе Казімір Тарасовічы. Фота сярэдзіны 1930-х гг.

Адзін з сыноў Гераніма, Дамінік Тарасовіч валодаў у Ваўкавыскім павеце маёнткам Крапіўніца, дзе з 1869 г. працаваў вінакурны завод № 159 [5]. Дамінік прымаў удзел у грамадска-палітычным жыцці павета. 20 кастрычніка 1865 г. ён быў зацверджаны ў якасці дваранскага дэпутата ад Ваўкавыскага павета для ўдзелу ў паседжаннях Гродзенскага губернскага праўлення. Да ліпеня 1865 г. гэтую пасаду займаў Фердынанд Калупайла. Пасля яго выхаду ў адстаўку пасада дэпутата вызвалілася. Гродзенскі губернскі маршалак шляхты прапанаваў кандыдатуру Дамініка Тарасовіча. Ва ўмовах тых часоў пасля паўстання кожная кандыдатура правяралася на благанадзейнасць. Губернскае Праўленне звярнулася да Крымінальнай Палаты з пытаннем, ці не быў Тарасовіч пад судом. Ваеннага Начальніка г. Ваўкавыска з паветам спыталі аб благанадзейнасці яго ў палітычным дачыненні. У Канцэлярыю Генерал-губернатара быў накіраваны запрос аб тым, ці ёсць перашкода для назначэння памешчыка Д. Тарасовіча на гэтую пасаду. З усіх гэтых устаноў былі атрыманы афіцыйныя адказы. З улікам іх кандыдатура Тарасовіча была прызнана дастойнай гэтай пасады, і Дамінік яе атрымаў [6, арк. 491–493]. З гэтага вынікае, што ў падзеях паўстання 1863 г. Дамінік заўважаны не быў і даказаў сваю лаяльнасць да расійскай улады.

У Дамініка-Стэфана была дачка Ванда-Марыя і два сыны – Павел-Дамінік і Чэслаў-Геранім [3, арк. 35 адв. –36]. Іх лёс і далейшыя нашчадкі не вядомы.

Другому сыну Гераніма, Канстанціну, належыў у Ваўкавыскім павеце маёнтак Гнезна [7, арк. 102]. Сядзіба ў Гнезна была пабудавана каля 1835 г. яе тагачасным гаспадаром (Францішкам або яго сынам Геранімам). Гэта быў мураваны аднапавярховы будынак, з двухпавярховым порцікам у цэнтры. З боку сада існавала тэраса, з якой сходы вялі ў парк. З абодвух бакоў сядзібы знаходзіліся невялікія аднапавярховыя квадратныя флігелі. Цікавым помнікам архітэктуры XIX ст. быў неагатычны лямус [2, с. 209-210]. З ускосных дадзеных вынікае, што Гнезна належыла Тарасовічам да 1937 г., хаця імёны гаспадароў таго часу не вядомы.

Канстанцін быў удзельнікам паўстання 1863 г. Не атрымалася высвятліць падрабязнасцей яго жыцця. Не вядома, ці ён адбываў наказанне і дзе. Ужо ў 1866 г. ён жыў у родных мясцінах, знаходзіўся пад наглядам паліцыі. У гэты час Канстанцін судзіўся за права вярнуць яму ў арэнду ферму Мсцібава, якую ён атрымаў у 1861 г. ад папярэдняга яе арэндатара Эдуарда Сасуліча з маёнтка Станіслававa [8, арк. 1–4].

Верагодна, Канстанцін меў сына Гераніма-Уладзіслава, які меў сына Канстанціна-Станіслава і дачку Кацярыну-Ядвігу Тарасовічаў, і тыя былі далучаны да шляхецкага саслоўя Указам Правячага Сената ад 29 студзеня (па старым стылі) 1893 г. Канстанцін і Кацярына былі аднесены да рода Тарасовічаў, зацвецверджанага "в сем достоинстве определением Герольдии Правительствующего Сената" ад 11 снежня (па старым стылі) 1833 г. Род гэты быў унесены ў шостую частку радаводнай кнігі [9, арк. 102–102 адв.].



***Іл. 2.*** Маёнтак Воля перад 1939 г.

Радаводныя кнігі былі ўведзены ў Расійскай імперыі ў 1785 г. Кнігі гэтыя вяліся Губернскімі дваранскімі дэпутацкімі сходамі і складаліся з шасці частак. У апошнюю частку ўключаліся старажытныя шляхецкія роды, радавод якіх пачынаўся да 1685 г. [10, с. 49]. Тое, што Тарасовічы адносіліся да шостай часткі радаводнай кнігі азначала, што род гэты быў стары і меў шмат доказаў сваёй шляхетнасці.

Трэці сын Гераніма, Уладзіслаў (1826–1898) валодаў маёнткам Конна, які не пазней 1850 г. атрымаў ад бацькі ў спадчыну [4, арк. 32]. Не пазней 1859 г. ён ажаніўся з Юзэфай Крывіцкай (1836–1902). Уладзіслаў, таксама як і брат, прыняў удзел у паўстанні, яго маёнтак Конна быў канфіскаваны.

Юзэфа Тарасовіч імкнулася выратаваць хаця б частку іх агульнай з мужам маёмасці. На імя імператара Аляксандра II ў красавіку 1864 г. яна падала прашэнне з просьбай вярнуць ёй грошы, якія яе муж атрымаў за яе ў якасці пасагу: "По обязательной записи 12-го января 1859 г. в Волковысском Уездном суде формально совершённой, муж мой Владислав Геронимов сын Тарассевич получил за мною приданного 12 тыс. руб. и сумму эту обеспечивая вотчинным имением Конно, расположенным в Волковысском уезде, обязался от таковой уплачивать мне ежегодно 6 %. Вдобавок означенному приданному, родитель мой согласно приведённому обязательству дал мне на окупировку капитал 3 тыс. руб., на который куплен мною нужный для имения рогатый скот, овцы, лошади и некоторая движимость.

На основании 569 Ст. Т. 10 ч. 1-й Свода Гражданских Законов, всякий договор и обязательство правильно составленное, налагают на договаривающихся обязанность их исполнить – а по разуму 1150 Ст. моё приданное, равно имущество приобретённое за окупировочную сумму, должны быть признаны за мою собственность, сверх частей указанных 1148 Ст. того же тома… Всеподдайнеше прошу, дабы повелено было: приобретённое мною имущество, а также указанные 1148 Ст. Т. 10 ч. 1 Свода Гражданских Законов части имения от секвестра освободить и за сим удовлетворить меня суммою 12 тыс. руб. с шестым от времени совершения документа по день выплаты процентом" [7, арк. 94–94 адв.].

24 мая 1864 г. Юзэфа Тарасовіч звярнулася да ўлад з прашэннем дапусціць яе да вядзення гаспадаркі ў маёнтку [7, арк. 96]. Верагодна, Юзэфа разам з дзвума дзецьмі паехала следам за мужам у ссылку. Аб гэтым сведчыць просьба У. Тарасовіча аб выдачы яму і яго сям'і грашовай дапамогі з казны, накіраваная ў 1865 г. на імя Тамбоўскага губернатара [7, арк. 138].

У Юзэфы быў вельмі ўплывовы бацька Юльян-Ксаверый Крывіцкі, які займаў пасаду маршалка шляхты Гродзенскай губерні. Яго сувязі адыгралі вельмі важную ролю пасля таго, як яго зяць Уладзіслаў Тарасовіч быў высланы ў г. Казлоў Томскай губерні (знаходзіўся там ужо ў снежні 1864 г.) [7, арк. 112]. Усе свае магчымасці і знаёмствы Юльян-Ксаверый накіраваў на тое, каб выратаваць маёмасць зяця і вярнуць яго на радзіму. 23 снежня 1865 г. было абнародавана "Высочайшее повеление", якое давала магчымасць Тарасовічу прадаць яго маёнтак. За дазволам да кіраўніцтва Тамбоўскай губерні звярнуўся камандуючы войскамі Віленскай ваеннай акругі. Ён прасіў адпусціць Тарасовіча ў Ваўкавыскі павет на 4 месяцы з мэтай продажу яго маёнтка Конна. Дазвол быў атрыманы і 25 лютага 1867 г. Тарасовіч выехаў з Казлова на радзіму.

Калі чатырохмесячны тэрмін набліжаўся да свайго завяршэння, Тарасовіч звярнуўся з просьбай дазволіць яму застацца яшчэ на 6 месяцаў. І зноў тут не абышлося без дапамогі яго цесця. 20 лістапада 1867 г. рэчаісны стацкі саветнік Юльян Крывіцкі напісаў запіску на імя Гродзенскага губернатара генерал-маёра Івана Мікалаевіча Скварцова з просьбай "Срок разрешения, на который зять мой Владислав Тарасович уволен в Гродненскую губернию для продажи имения, оканчивается в первых числах наступающего декабря месяца. Как же расчёты по продаже имения ещё не окончены по причинам, зависящим от покупщицы, я обратился к Господину Генерал Губернатору с ходатайством о разрешении Тарасовичу остаться в крае, то по сему имею честь покорнейше просить Ваше Превосходительство, принять в уважение, что Тарасович первый в Гродненской губернии исполнил указ от 10 декабря 1865 г., продолжить ему срок пребывания в Гродно на шесть месяцев до окончания расчётов" [11, арк. 6–6 адв.].

Улады дазволілі адстаўному калежскаму сакратару Уладзіславу Тарасовічу штомесяц працягваць яго прыбыванне ў Гродзенскай губерні [11, арк. 7]. Захавалася некалькі ўласнаручных заяў У. Тарасовіча с просьбай працягнуць яго прыбыванне ў Гродзенскай губерні. У ліпені 1868 г. Тарасовіч атрымаў дазвол застацца яшчэ на 3 месяца [11, арк. 40]. Аднак, не гледзячы на такую моцную падтрымку з боку мясцовай шляхты, У. Тарасовіч быў абмежаваны ў сваіх перамяшчэннях. У снежні 1867 г. ён звярнуўся да Скварцова з просьбай дазволіць яму выехаць у маёнтак цесця Зяльвяны, які ў тыя часы знаходзіўся на мяжы Гродзенскага і Ваўкавыскага паветаў.

Між іншым, ужо 20 красавіка 1868 г. была аформлена купчая на маёнтак Конна. Яго набыла княгіня Елізавета Аляксееўна Валконская. Аднак, па сцвярджэнні Тарасовіча, яна заплаціла не ўсю суму. Гэтая акалічнасць стала повадам для таго, каб да канца 1868 г. Уладзіслаў Тарасовіч заставаўся на радзіме [11, арк. 8–11 адв.] Крывіцкі аформіў афіцыйнае паручыцельства за зяця, у якім браў на сябе адказнасць за яго паводзіны [11, арк. 42].

Верагодна, іншай нерухомасці Уладзіслаў не меў. Ён мог жыць толькі ў маёнтках Зяльвяны і Воля (каля в. Лунна Мастоўскага р-на Гродзенскай вобласці), набытых яшчэ дзедам Юзэфы, Ксаверыям Крывіцкім. У лістападзе 1818 г. той набыў у Ваўкавыскім павеце ў кн. Ксаверыя Друцкага-Любецкага маёнтак Воля, ў 1830 г. маёнтак Зяльвяны ў Фердынанда Эйсмонта г. [12, арк. 3-12]. Пасля смерці Ксаверыя Крывіцкага яго маёмасць была падзелена паміж яго нашчадкамі. Па раздзельным запісе ад 5 жніўня 1830 г. яго сыну Юльяну-Ксаверыю адышоў маёнтак Воля. Пасля смерці самога Юльяна-Ксаверыя Крывіцкага каля 1884 г. на яго спадчыну прэтэндавалі дачка Юзэфа Тарасовіч і ўнук барон Сігізмунд Сігізмундавіч Дангель. Адпаведна ўводнага ліста яны былі ўведзены ў агульнае валоданне маёнткам Воля*. Пасля смерці пляменніка каля 1894 г. Юзэфа атрымала ў спадчыну яго частку маёнтка Воля і мястэчка Воля [12, арк. 3–4].

Уладзіслаў памёр у 1898 г. і быў пахаваны ў Гнезна, каля свайго дзеда Францішка і бабкі Магдалены Тарасовічаў. Уладзіслаў меў двух дзяцей – сына Юліяна-Канстанціна (1859–1911) і дачку Марыю-Севярыну-Вікторыю (1862–1912), якая пайшла замуж за Влодэка (імя не вядома). Матэрыяльнае іх становішча было даволі добрым, дзякуючы спадчыне дзеда Юльяна Крывіцкага. Жонкай Юльяна-Канстанціна стала Ядвіга, дачка памешчыка Эдварда Талочкі (1840–1912) з маёнтка Вердамічы Ваўкавыскага павета.

Гісторыя роду Тарасовічаў у пачатку ХХ ст. даволі падрабязна адлюстравана ў мемуарах Цэцыліі Цішэўскай з Талочкаў, якая была роднай пляменніцай Ядвігі Тарасовіч – дачкой яе брата Юльяна. Вельмі часта Цэцылія гасцявала ў цёткі, добра ведала ўсе абставіны жыцця яе сям'і.



***Іл. 3.*** Ядвіга-Эмілія Тарасовіч з сынамі Станіславам і Казімірам

Юльян і Ядвіга з дзецьмі жылі ў маёнтку Зяльвяны, які тады належыў яго маці. Відаць, гэтая сядзіба ў стылі позняга класіцызма была пабудавана яшчэ Ксаверыям Крывіцкім. Будынак быў прыгожы – двухпавярховы ў цэнтры і аднапавярховы па баках. Порцік падтрымлівалі чатыры масіўныя калоны. Парку амаль не было, таму што сядзіба знаходзілася блізка да мястэчка. Насупраць цэнтральнага ўваходу стаяла ўяздная брама [2, с. 416–417]. Ц. Цішэўская ўспамінала гэтую сядзібу, якая была не вельмі вялікай, з маленькім садам над самым Неманам. Веранду ад рэчкі аддзяляла толькі сцежка. На другім беразе былі вялікія лясы, у якіх знаходзіўся маёнтак Міхалаўка паноў Ловіцкіх. У гэтай сям'і былі дзеці, па якіх гаспадыня пасылала паром з Зяльвян, калі сярод яе гасцей былі дзеці. На Цэцылію вялікае ўражанне аказалі "крэсовыя" паромы. Яна згадвала, што ў тыя часы з Зяльвян у Гродна два разы на дзень хадзіў паром, таму што не было масту над Нёманам і чыгункі [13, арк. 26].

Аднак гэтая сітуацыя даволі хутка змянілася. У пачатку ХХ ст. на землях Тарасовічаў праходзіла будаўніцтва чыгункі Полацк-Седліцэ. У 1906 г. Юльян прадаў Казённаму Упраўленню па будаўніцтву чыгункі некалькі надзелаў плошчай 42,5 дзес. зямлі [14, арк. 1–16].

Пасля смерці мужа Юзэфа Тарасовіч, відаць, жыла ў Волі. У 1862 г. у заходніх губернях Расійскай імперыі было скасавана права прапінацыі памешчыкаў. Яны атрымалі кампенсацыі, якая была ўключана ў кошт абавязковага выкупу сялянамі сваіх надзелаў. 11 мая 1896 г. быў выдадзены закон, які прызначаў грашовую ўзнагароду асобам і ўстановам, якія адмянілі права прапінацыі ў прыватных мястэчках. Права прапінацыі – права вырабу і продажу моцных спіртовых напіткаў, належыла памешчыкам на іх землях. Часцей за ўсё права прапінацыі прадавалася памешчыкамі ў арэнду яўрэям. Дзяржава выкупала гэтае права ў памешчыкаў і ўводзіла казённы продаж моцных напіткаў [15, с. 565]. Пасля выхаду гэтага закона Юзэфа Тарасовіч звярнулася за ўзнагародай за адмену права прапінацыі ў мястэчку Воля [12, арк. 1–2]. Спецыяльная камісія вывучыла дакументы і пастанавіла, што гадовы даход ад прапінацыі ў Волі ў 1890-1894 гг. не перавышаў 475 руб. Такім чынам, сума ўзнагароды за адмену права прапінацыі Ю.Ю. Тарасовіч павінна была складаць 9 тыс. 500 руб. [12, арк. 59] Архіўная справа аб адмене права прапінацыі дазваляе высвятліць, якім чынам маёнткі Крывіцкіх Зяльвяны і Воля трапілі ў рукі памешчыкаў Тарасовічаў.

Цэцылія Цішэўская ў дзяцінстве сустракала Юзэфу Тарасовіч, калі тая зрэдку прыязджала да сына ў Зяльвяны. Цішэўская згадвала яе, як маленькую старую пані, абкружаную старымі слугамі, якая мала размаўляла з гасцямі, звычайна сядзела самотна [13, арк. 26].

У 1902 г. Юзэфа Тарасовіч памерла і была пахавана каля мужа ў Гнезна. Маёнткі яе перайшлі дзецям. У 1904 г. маёнтак Воля налічваў 1084 дзес. зямлі (з іх 1005,5 дзес. зручнай), маёнтак Зяльвяны – 1679 дзес. (з іх 1077 зручнай). Вядома, што ў той час Юльян жыў з сям'ёй менавіта ў Зяльвянах [16, арк. 9–11 адв.].

Акт аб падзеле маёмасці, пакінутай Юзэфай Тарасовіч, паміж яе сынам Юльянам-Канстанцінам і дачкой Марыяй-Севярынай-

** З ускосных дадзеных вынікае, што ў Юзэфы была сястра, якая выйшла замуж за барона Сігізмунда Дангеля і мела адзінага сына, названага ў гонар бацькі. Відаць, сам С.С. Дангель нашчадкаў не меў.*

Вікторыяй Влодэк з Тарасовічаў быў зацверджаны 14 ліпеня 1904 г. Юльян-Канстанцін атрымаў маёнтак Воля з фальваркамі Сямашкаўшчына і Вільфорын з прыналежнасцямі і дзвума млынамі ў Гродзенскім павеце (плошча 1084 дзес., кошт 72 тыс. 600 руб.). Яму дасталася і частка маёнтка Зяльвяны ва ўрочышчах Сасновы Лес, Чорнае, Дварэцкае Балота і Дварышчы (268 дзес.), сам маёнтак Зяльвяны з фальваркам Едлінкі і Пакровы з рознымі ўрочышчамі і крахмальным заводам у Ваўкавыскім павеце (1200 дзес., кошт 87 тыс. руб.) [17, арк. 1–3].



***Іл. 4.*** Ядвіга і Эдвард Тарасовічы з сынам Казімірам. Каля 1938 г.

У 1911 г. памёр Юльян Тарасовіч. Таксама як і яго бацькі, Юльян меў адзінага сына Эдварда-Мар'яна (?–пасля 1939) і дачку Юзэфу-Марыю (1899–1932).

Цэцылія шмат пісала пра сваю цётку Ядвігу Тарасовіч, якая была, на яе думку, вельмі прыгожай і мела добрую фігуру. У маладосці яна закахалася ў Аляксандра Домбскага з Руднай, які не адказваў на яе пачуцце. Каб адпомсціць Домбскаму, Ядвіга пайшла замуж за Юльяна Тарасовіча. Усю сваю любоў Ядвіга аддавала дзецям, асабліва дачцэ. Ядвіга вельмі любіла гасцей, была вясёлай і кампанейскай. У яе было шмат суседзяў памешчыкаў, з якімі яна падтрымлівала цесныя адносіны, часта ездзіла ў Вердамічы да сваіх бацькоў і брата.

Сын Юльяна і Ядвігі, Эдвард-Мар'ян быў названы ў гонар свайго дзеда Эдварда Талочкі. Падлеткам ён вучыўся ў расійскай гімназіі ў Мінску, дзе жыў у доме ў знаёмых маці па прозвішчы Лапа. Яго дваюрадная сястра Цэцылія шмат пісала пра яго ў сваіх мемуарах, адносілася да яго вельмі цёпла. Яна згадвала, што ўжо ў дзяцінстве Эдвард ведаў, што атрымае бацькоўскім маёнткі. Чытаючы пацер маленькім хлопчыкам, ён гаварыў "будзь Воля мая і Зяльвяны" [13, арк. 27].



***Іл. 5.*** Эдвард, Казімір і Станіслаў Тарасовічы. 1939 г.

У спадчыну пасля бацькі зусім яшчэ юнаму Эдварду дастаўся маёнтак Воля. Перад І-й сусветнай вайной ён ажаніўся з Ядвігай-Эміліяй Дзяконскай (1895–1939) з маёнтка Пятровічы Кобрынскага павета, малодшай дачкой Альбіна-Яна Дзяконскага. У час вайны, адпаведна расійскаму праву, Эдвард Тарасовіч не быў мабілізаваны, таму што быў адзіным сынам. Ён быў заняты справамі маёнткаў. Вядомы на ўсю акругу яго ўпраўляючы пан Казлоўскі на той момант ужо адсутнічаў. Ядвізе Тарасовіч і яе дачцэ Юзэфе было дома сумна, таму іх запрасілі ў Вердамічы, дзе яны прабылі некалькі месяцаў. Адносіны паміж Ядвігай і жонкай яе брата Юльяна былі вельмі добрымі.

Летам 1915 г. пачалося актыўнае наступленне нямецкіх войск, многія жыхары заходніх рэгіёнаў Беларусі пакідалі свае родныя мясціны, перамяшчаліся на ўсход. Цішэўская падрабязна апісвала пераезд у Мінск, які працягваўся тыдзень. Цяжка было знайсці месца для начлега, а мясцовыя жыхары па-рознаму ставіліся да бежанцаў. У Міры сям'я Талочкаў папрасілася пераначаваць у плябаніі мясцовага ксяндза. Ішоў моцны дождж. Ксёндз з неахвотай пусціў іх у сталовую. Раніцай у 9 гадзін ён выправадзіў гасцей. Высветлілася, што адзін з фурманаў адказваецца ехаць далей. Цэцылія вымушана была сесці на козлы тройкі. Далей Цішэўская ўспамінае: "Нарэшце бачым нейкую вёску, касцёл і плябанію, але трэба рэзка павярнуць на масток над ровам, каб заехаць у двор плябаніі. Трэці конь мне ссоўваецца да рову, я пранізліва ўскрыкваю. Збегам акалічнасцей у гэтай плябаніі начуе цёця Ядвіга з Юзяй, панія Бараноўская і Эдзё (Эдвард) з жонкай. Эдзё на мой крык сказаў: "Гэта голас Цэсі" і выбег на двор…" [13, арк. 179–186] Сем'і Тарасовічаў і Талочкаў пасяліліся ў Мінску ў адным доме № 16 на вул. Захар'еўскай, разам вялі гаспадарку.




***Іл. 6.*** Род Тарасовічаў. Генеалагічнае дрэва.

У 1920–1930-я гг. сям'я Эдварда і Ядвігі-Эміліі Тарасовічаў жыла ў Волі, дзе была вельмі прыгожая сядзіба, яе тагачасны выгляд захавалі старыя здымкі. Відаць, Эдвард Тарасовіч меў нейкія фінансавыя праблемы, таму што маёнтак Воля быў закладзены ў

Віленскім Земскім банку. Па дадзеных на 1937 г. за гэтым маёнткам плошчай 561 га значылася пазыка ў 104 тыс. 224 зл. [18, с. 5–16].

Юзэфа-Марыя (1899–1932) стала жонкай Станіслава Квілецкага. Юзэфа была вельмі шчаслівай у шлюбе, жыла з мужам у яго родавым маёнтку Квіліч у Познаньскім ваяводстве. Аднак яна памерла ў Гданьску вельмі маладой, пахавана ў Квілічы [13, арк. 40].

У Ядвігі-Эміліі і Эдварда Тарасовічаў было два сыны: старэйшы Казімір нарадзіўся 20 снежня 1919 г., малодшы Станіслаў – 8 мая 1922 г. Хлопчыкі вучыліся ў гімназіі айцоў-езуітаў у Вільні. На старых здымках тых часоў усе члены сям'і выглядаюць шчаслівымі. Вось сыны-падлеткі пазіруюць са стрэльбамі, абкружаныя паляўнічымі трафеямі. Яшчэ адзін здымак прадстаўляе Ядвігу-Эмілію, яе мужа і сына Казіміра каля матацыкла. Маці дарослага сына, гэтая жанчына захоўвала стройнасць і дзявочую фігуру. Здымак прадстаўляе яе на матацыкле, які ў тыя часы з'яўляўся сімвалам дастатку і тэхнічнага прагрэсу.

20 сакавіка 1939 г. памерла Ядвіга-Эмілія, яна была пахавана ў Варшаве на знакамітых могілках Павонзках. Пасля заняцця зямель Заходняй Беларусі савецкімі войскамі ў верасні 1939 г. Эдвард Тарасовіч разам з малодшым семнаццацігадовым сынам Станіславам быў арыштаваны. Эдварда вывезлі ў глыб Расіі, далейшы лёс яго не вядомы. Станіслаў змог выжыць, трапіў на тэрыторыю адной з азіяцкіх рэспублік СССР, магчыма, у ваколіцы Ташкента. Невядома, якім чынам ён апынуўся ў арміі генерала Андэрса. Вайсковы шлях Станіслава быў падобны на большасць лёсаў салдат Андэрса: ён ваяваў пад Монтэ-Касіна. Пасля вайны трапіў у Англію, дзе сустрэў сваю будучую жонку Марыён Алан (нар. у 1932 г.).

Хутка маладая сям'я пераехала на пастаяннае пражыванне ў канадскі горад Манрэаль. Станіслаў Тарасовіч выкарыстоўваў англізаваную форму свайго імя і прозвішча – Стэнлі Дэ Тэры. Працаваў графікам. У 1987 г. ён прыязджаў у Польшу, каб сустрэцца з братам, якога не бачыў цэлых 50 гадоў. Станіслаў памёр у Манрэалі 9 снежня 1992 г., дзе да гэтага часу жыве яго жонка Марыён і двое дзяцей. Дачка Джэнет у шлюбе з Лі Харысанам мае дачку Ізабэлу Доўн (нар. у 1991) і сына Марка (нар. у 1996). Сын Станіслава Роджэр Дэ Тэры нарадзіўся ў 1963 г., жонкі і дзяцей не мае. Лі Харысан валодае ў Манрэалі фабрыкай шкла і люстэркаў, дзе працуе яго жонка Джэнет і яе брат*.

Лёс Казіміра быў вельмі складаным. У 1939 г. ён не трапіў у савецкія турмы. Відаць, ён апынуўся на тэрыторыі, захопленай немцамі. У 1941 г. ён вярнуўся ў родныя мясціны, аднак пасяліцца ў бацькоўскім доме не змог. З прыходам немцаў на базе былога маёнтка Воля было арганізавана сельскагаспадарчае прадпрыемства. У якасці агранома на ім працаваў Рыгор Жвалеўскі (1915-1999), які да 1939 г. скончыў школу аграномаў (нешта накшталт сучаснага тэхнікума), потым ужо пры савецкай уладзе каля года вучыўся на курсах у Горы-Горках. Немцы прымусілі Жвалеўскага кіраваць фермай у Волі, разам з жонкай і маленькім сынам Георгіем ён пасяліўся ў будынку былой сядзібы Тарасовічаў.

Казімір Тарасовіч пасяліўся ў Лунна, дзе працаваў на пошце. Аднак часам ён наведваўся ў бацькоўскі дом. Паступова ён пасябраваў з аграномам Жвалеўскім і яго сям'ёй. Аднойчы паўстала пытанне аб хрышчэнні маленькага Георгія (бацькі яго звалі Юркай). "Пан" Казімір сам прапанаваў сябе ў якасці хроснага бацькі. Павага мясцовых жыхароў да былога гаспадара маёнтку была вялікай. Ваеннае ліхалецце прымусіла людзей не звяртаць увагі на старыя абіды і розніцу ў сацыяльным статусе. Праваслаўны свяшчэннік не быў супраць такога кандыдата ў хросныя бацькі, які быў каталікам**. Любоў Жвалеўская ўспамінала, што Казімір меў характар спакойны і мяккі***.

Пасля вызвалення Беларусі ў 1944 г. Казімір Тарасовіч быў арыштаваны, атрымаў 25 гадоў за супрацоўніцтва з Арміяй Краёвай. У 1953 г. яго саслалі ў Казахстан, куды да яго з Лунна прыехала нявеста Людвіка Швед (1916-1989). Казімір меў адукацыю фельдшара, працаваў разам з жонкай у шпіталі ў г. Акчатаў.

У 1955 г. у Казахстане нарадзілася адзіная дачка Казіміра, Ядвіга-Стэфанія. Праз год сям'я атрымала дазвол на пераезд у Польшчу на землі ў сучасным заходнепаморскім ваяводстве. Па дарозе туды у касцёле в. Каменка каля Скідзеля (зараз у Шчучынскім раёне) Казімір і Людвіка павянчаліся і пахрысцілі маленькую Ядвігу. Да пенсіі Казімір працаваў фельдшарам, памёр у Гнезна праз месяц пасля спаткання з братам 17 лютага 1988 г.

Ядвіга-Стэфанія скончыла філалагічны факультэт Познаньскага універсітэта, выйшла замуж за Паўла Хэлміняка (нар. у 1956 г.), яна мае адзінага сына Міхала-Ежы, які нарадзіўся ў 1981 г. Ядвіга працуе настаўніцай польскай мовы і літаратуры ў польскім горадзе Гнезна*.

Гісторыі шляхецкага роду Тарасовічаў прадстаўляецца нам тыповай для заходнебеларускага рэгіёну. Напярэдадні паўстання 1863 г. кожны з трох братоў Тарасовічаў валодаў адным маёнткам у Ваўкавыскім павеце: Дамінік – Крапіўніцай, Канстанцін – Гнезна, Уладзіслаў – Конна. Два з іх прынялі ўдзел у паўстанні. Рэпрэсіі ўдзельнікамі ўдарылі па матэрыяльным становішчы рода, былі страчаны неукаторыя маёнткі.

Праследаванні былых памешчыкаў ў 1939 і 1944 гг. прывялі да таго, што роды або былі знішчаны, або былі вымушаны з'ехаць за мяжу. Адзіны дакладна вядомы нам мужчынскі нашчадак роду Тарасовічаў з Ваўкавыскага павета ў простай лініі, Роджэр Дэ Тэры 1963 г. нараджэння жыве зараз у Канадзе. Магчыма, існуюць і іншыя нашчадкі роду Тарасовічаў, якія паходзяць ад братоў Канстанціна і Дамініка-Стэфана. Нашчадкі іх роднага брата Уладзіслава даследаваны даволі падрабязна.

Да нашых дзён захаваліся некаторыя пабудовы ў былых маёнтках памешчыкаў Тарасовічаў. На акраіне в. Лунна ў Мастоўскім раёне стаіць будынак былой сядзібы Воля, які зараз знаходзіцца ў вельмі дрэнным стане. У в. Гнезна Ваўкавыскага раёна размешчана родавая капліца Тарасовічаў, дзе пахаваны Францішак, яго жонка Магдалена, унук Уладзіслаў з жонкай Юзэфай, праўнукі Юльян і Марыя. Даследаванне гісторыі роду Тарасовічаў патрабуе працягу. Вынікі такога даследавання могуць быць выкарыстаны пры напісанні прац па краязнаўству, па гісторыі шляхты Ваўкавышчыны і ўсёй Гродзенскай губерні, пры распрацоўцы турыстычных маршрутаў і экскурсій па мясцінах, звязаных з родам Тарасовічаў.

### СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. НГАБ у г. Гродна. Ф.1, воп. 32, спр. 1. Формулярные списки служащих в учреждениях Гродненской губернии за 1802 г.
2. Aftanazy R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. Województwa brzesko-litewskie, nowogródzkie. Wrocław-Warszawa-Kraków: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1992. – Tom 2.
3. НГАБ у г. Гродна. Ф. 332, воп. 2, спр. 3. Список потомственных дворян Волковысского уезда. 1910 г.
4. НГАБ у г. Гродна. Ф. 96, воп. 1, спр. 516. Дело об утверждении инвентарного описания имения Конноя Волковысского уезда помещика Тарасовича Геронима (1845-1851).
5. НГАБ у г. Гродна. Ф. 30, воп. 1, спр. 49. Материалы по винокуренному заводу № 159 Тарасовича Доменика Геронимовича в имении Кропивница Волковысского уезда (1869-1914).
6. НГАБ у г. Гродна. Ф. 2, воп. 32, спр. 633. Журнал присутствия губернского правления за 1865 г.


* *Дадзеныя прадстаўлены Ядвігай-Стэфаніяй Хэлміняк з Тарасовічаў, дачкой Казіміра Тарасовіча.*

** *Цікавыя лёсы напаткалі героях гэтых падзей пасля вайны. Рыгор Жвалеўскі пасля вызвалення Беларусі быў прызваны ў савецкую армію, ваяваў у Польшчы. Рыгор Жвалеўскі займаў пасады галоўнага агранома і намесніка старшыні ў некалькіх калгасаў Гродзеншчыны. Ніколі не быў членам партыі, аднак яго заслугі як агранома-перадавіка шматразова былі адзначаны на самым высокім дзяржаўным узроўні. Атрымаў ганаровае званне "Заслужаны аграном БССР". Хрышчоны сын Казіміра Тарасовіча, Георгій Жвалеўскі, скончыў гістарычны факультэт БДПУ імя М. Танка, працаваў настаўнікам, супрацоўнікам гаркама партыі, зараз жыве ў Вілейцы. Усё жыццё ў гэтай сям'і існавала лягенда пра тое, як яго хрысціў "пан".*

*** *Па ўспамінах Л. Жвалеўскай, жонкі Рыгора.*

* *Дадзеныя прадстаўлены Ядвігай-Стэфаніяй Хэлміняк.*

7. НГАБ у г. Гродна. Ф. 31, воп. 1, спр. 37. Дело о передаче конфискованного им. Конно Волковысского уезда помещиков Тарасовичей и др. участников восстания в Казённое ведомство (1863-1869).
8. НГАБ у г. Гродна. Ф. 1, воп. 6, спр. 471. Дело по прошению помещика Тарасовича о возврате ему до прекращения контрактного срока фермы Мстибово (1866 г.)
9. НГАБ у г. Гродна. Ф. 332, воп. 4, спр. 2. О причислении Тарасовичей Константина-Станислава и Екатерины-Ядвиги к дворянскому роду. Указ Сената от 29 января 1893 г.
10. Вяроўкін-Шэлюта, У. Радаводныя кнігі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 6, кн. 1, Мн., 2001. С. 49.
11. НГАБ у г. Гродна. Ф. 1, воп. 31, спр. 110. Дело о разрешении участнику восстания помещику Тарасовичу Владиславу приезда в Гродненскую губернию для продажи имения (1866-1868 гг.)
12. НГАБ у г. Гродна. Ф. 30, воп. 1, спр. 182. Дело за 15 ноября 1897 г. – 2 августа 1900 г. о выдаче вознаграждения владелице местечка Воля Гродненского уезда Тарасович Юзефе Юлиановне за отмену пропинационного права.
13. Ciszewska, C. Gawęda o tym, co było. Rękopis. 1961. Biblioteka Narodowa, zbiory specjalne.
14. НГАБ у г. Гродна. Ф. 24, воп. 3, спр. 3961. Дело по сообщению старшего нотариуса Гродненского окружного суда о переходе земли в им. Зельвяны Волковысского уезда (1679 дес.) от дворянина Тарасовича Ю.В. к управлению по строительству железной дороги (1906).
15. Анішчанка Б.Я. Прапінацыя // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 5. Мн.: БелЭнц. 1999, С. 565.
16. НГАБ у г. Гродна. Ф. 24, воп. 3, спр. 3789. Документы (справки, прошения) о площади земли у землевладельцев в имениях Гродненской губернии 1904 г.
17. НГАБ у г. Гродна. Ф. 24, воп. 3, спр. 3833. Дело по сообщению ст. нотариуса гродненского окружного суда о разделе имения Воля Гродненского уезда (1064 дес.) и имения Зельвяны Волковысского уезда (1679 дес.) между дворянами Тарасовичем Конскантином Владиславовичем и Влодэк Марией (1904 г.)
18. Obwieszczenie // Słowo. 1937. 14 kwietnia. S. 5-16.

*Материал поступил в редакцию 25.10.09*

**POPKO O.N. SORT Tarasovichs in Volkovysk district Grodno province in XIX-XX centuries**

The article is devoted to the history of the landowner family Tarasovich, which possessions in XIX century were situated on the territory of Volkovysk district. In 1863 two brothers Konstantin and Vladislav Tarasovich took part in the revolt against the Russian government. They were banished in the remote provinces of Russia, and their manors were confiscated. Vladislav's father-in-law Julian Krivitsky helped them to organise the sale of the manor Konno. Later Vladislav's descendants lived in manors, which they passed from Krivitsky by right of succession.

The author investigates the biographies of the basic representatives of Tarasovich family on the basis of the wide range of archival sources. The important information about the family is presented in the memoirs of Cecila Tishevska, which is not published. The successors, who live in Poland, helped to restore the history of Tarasovichs after 1939 and presented rare photos.

УДК 94(476)

***Сумко А.В.***

# МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЕ І КАДРАВАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ КНІГАВЫДАВЕЦТВА БССР З 1919 ПА 1941 ГОД

Паліграфічная прамысловасць у Беларусі да першай сусветнай вайны канцэнтравалася ў гарадах з адносна развітай прамысловай вытворчасцю і навучальнымі ўстановамі. Адпаведна росту попыту на друкаваную прадукцыю павялічвалася і колькасць друкарняў, кнігарняў. У Мінску, Гомелі, Магілёве налічвалася 25 друкарняў з агульнай колькасцю працоўных да 400 чалавек [1, с. 464]. У астатніх гарадах прадпрыемствы паліграфічнай прамысловасці размяркоўваліся ў суадносінах з выдавецкімі запатрабаваннямі. Так, у Оршы дзейнічалі чатыры друкарні, у Полацку і Бабруйску – па тры, у Лепеле і Рагачове – па дзве і г.д. [2, с. 289]. З большасці друкарні насілі прыватнапрадпрымальніцкі характар. Звычайна на іх працаваў сам гаспадар з сям'ёй або некалькімі наёмнымі работнікамі.

У межах палітыкі ваеннага камунізму ў кнігавыдавецкай справе БССР адбываліся наступныя працэсы: спачатку нацыяналізацыя лепшай матэрыяльна-тэхнічнай базы, затым канцэнтрацыя яе ў Паліграфаддзеле пры ВСНГ БССР і цэнтралізаванае размеркаванне папяровых рэсурсаў. У распараджэнні Паліграфічнага аддзела знаходзіліся друкарні Мінска, Барысава, Бабруйска, Мазыра, Ігумена, Слуцка [3, л. 98]. Большасць з нацыяналізаваных друкарняў была абсталявана старымі, зношанымі машынамі. Акрамя гэтага, ваенныя дзеянні падчас першай сусветнай і польска-савецкай войнаў моцна паўплывалі на выдавецкія магчымасці рэспублікі. Адна частка друкарскага абсталявання была ліквідавана, а другая эвакуіравана і вывезена за межы БССР. Так, падчас польска-савецкай вайны ў кастрычніку 1920 года ў Смаленск былі звезены ўсе шрыфты і запасы паперы з Мінска [4, л. 1]. Гэта скараціла да мінімальных памераў выдавецкую справу ў БССР, а выпуск друкаванай прадукцыі на нацыянальных мовах зрабіла немагчымым.

Адзіным заказчыкам Паліграфічнага аддзела стала Беларускае аддзяленне Дзяржаўнага выдавецтва РСФСР у Мінску, створанае ў снежні 1920 года на базе скасаваных адміністрацыйных апаратаў рэдакцый разнастайных ведамасных выдавецкіх аддзелаў. Нацыяналізаваныя друкарні былі перагружаны выпускам агітацыйных плакатаў, лістовак, газет. Гэта дрэнна адбівалася на тэхнічным стане друкарняў.

На рэдакцыйна-выдавецкія планы ўплывала крызіснае становішча з папяровымі рэсурсамі. Так, выпуск паперы ў 1921 годзе быў ніжэй у 5,7 разоў у параўнанні з даваенным часам і склаў толькі 1, 8 тысячы тон [5, с. 21]. Таму за доступ да матэрыяльных рэсурсаў друкарскай справы адразу разгарнулася жорсткая барацьба. Яшчэ ў 1917 г. У.І. Ленін сфармуляваў тэзіс, які потым быў пакладзены ў аснову выдавецкай палітыкі: "Государственная власть, в виде Советов, берёт все типографии и всю бумагу и распределяет её справедливо: на первом месте государство, в интересах большинства народа, особенно большинства крестьян, которых веками мучили, забивали и отупляли помещики и капиталисты. Вот такое распределение бумаги было бы справедливо, и при власти в руках Советов, осуществимо без всякого труда" [6, с. 212]. Размеркаванне папяровых рэсурсаў адбывалася строга цэнтралізавана, адпаведна ішлі дырэктывы, што і колькі друкаваць. У выніку кніжная прадукцыйнасць была зніжана ў 3 – 4 разы ў параўнанні з даваенным часам, дамінуючае месца ў рэпертуары выдавецтваў займалі брашуры агітацыйна-прапагандысцкага характару.

Пасля нацыяналізацыі надзённым стала пытанне аб кадравым забеспячэнні выдавецтваў, бо не хапала спецыялістаў. Практыкавалася прыцягненне спецыялістаў непралетарскага паходжання, якія працавалі ў друкарнях яшчэ да рэвалюцыі. Аднак гэта не вырашыла кадравую праблему. Так, штат Беларускага аддзялення Дзяржвыда-

***Сумко Алена Вячаславаўна**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Установы адукацыі "Полацкі дзяржаўны універсітэт".*
*Беларусь, ПДУ, 211440, Віцебская вобл., г. Наваполацк, вул. Блахіна, 29.*